## Саміт калектыўнай бяспекі

**Сесія Савета калектыўнай бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы адбудзецца заўтра ў Мінску. Удзел у ёй прыме Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

На саміце будуць падведзены вынікі беларускага старшынства ў АДКБ у 2017 годзе. Беларусь ставіла задачы ўзмацніць уплыў арганізацыі на міжнароднай арэне, павысіць аператыўную гатоўнасць Калектыўных сіл, гарантаваць эканамічную бяспеку дзяржаў-членаў, а таксама рэалізаваць комплекс дадатковых мер па процідзеянні міжнароднаму тэрарызму, распаўсюджванню наркотыкаў і незаконнай міграцыі ў рэгіёнах калектыўнай бяспекі.

Чакаецца, што па выніках саміту будзе прыняты шэраг рашэнняў па розных напрамках дзейнасці АДКБ, у якіх, у тым ліку, знойдуць адлюстраванне прыярытэты беларускага старшынства.

Кіраўнікі дзяржаў таксама абмяркуюць найважнейшыя праблемныя моманты сучаснай абстаноўкі ў свеце і далейшае развіццё арганізацыі ў якасці магутнай структуры, якая гарантуе бяспеку ў рэгіёне.

## На службе сяброўства краін

У Палацы Незалежнасці прайшла сустрэча з Паслом Казахстана

**Кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка рэгулярна сустракаецца з дыпламатамі, якія шмат зрабілі для развіцця адносін сваёй краіны з Беларуссю. Такія мерапрыемствы традыцыйныя напрыканцы дыпламатычных місій. Учора Прэзідэнт сустрэўся з Ергалі Булегенавым, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Казахстан у нашай дзяржаве.**

Сёння нашу краіну наведвае лідар гэтай краіны, таму сустрэчу з казахстанскім паслом Прэзідэнт назваў «добрым уступам» да гэтага візіту.

— Што дрэнна — што сябры з'язджаюць, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Жыццё дыпламатаў такое, як і ў ваенных. Адслужыў тэрмін — паехаў на іншую работу. Мы гэта разумеем, але яшчэ раз падкрэсліваю: вы для нас чалавек не чужы. Вы рабілі вельмі шмат для таго, каб у нас былі вельмі добрыя адносіны паміж дзвюма краінамі.

Беларускі лідар назваў Ергалі Булегенава «сапраўдным прадстаўніком казахстанскага народа»:

— Не збіраюся тут казаць аб прасунутых нашых адносінах. Казахстан — гэта адна з краін, з якімі мы маем самыя блізкія адносіны. Мы ў эканамічным саюзе з вамі (Еўразійскім эканамічным саюзе. — **Аўт.**), у нас няма палітычных рознагалоссяў, мы аднолькава глядзім на парадак дня міжнародных адносін. Словам, разыходжанняў у нас практычна няма ніякіх, і ў гэтым вялікая ваша заслуга — ва ўмацаванні сяброўства паміж Казахстанам і Беларуссю.

Кіраўнік нашай дзяржавы выказаў спадзяванне, што дыпламат назаўсёды застанецца сябрам нашай дзяржавы.

**У тэму**

**Ергалі Булегенаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь, заявіў па выніках сустрэчы з беларускім лідарам:**

— Амаль шэсць гадоў працы ў Беларусі праляцелі вельмі імкліва, відаць, таму, што я быў пастаянна ў рабоце па ўмацаванні нашых двухбаковых адносін. Яны ў нас маюць глыбокія карані. Думаю, я зрабіў свой унёсак у справу па іх пашырэнні.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*




# «Дарожная карта» на падыходзе

Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з віцэ-прэзідэнтам Венесуэлы па пытаннях планавання

**Месяц таму нашу краіну з афіцыйным візітам наведаў Прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура. Падчас сустрэчы з беларускім лідарам было пацверджана агульнае жаданне аднавіць супрацоўніцтва.**

А ўчора падчас сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з віцэ-прэзідэнтам па пытаннях планавання — міністрам планавання Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Рыкарда Менэндэсам сярод іншых пытанняў абмяркоўваўся візіт кіраўніка нашай дзяржавы ў Каракас — ужо ў 2018 годзе.

— Не хаваю: чакаў гэтай сустрэчы, — прызнаўся беларускі лідар на пачатку размовы. — Перш за ўсё, каб павіншаваць вас з пераканаўчай перамогай на паказальных рэгіянальных выбарах. Я вас вельмі моцна прашу: перадайце майму сябру Прэзідэнту Венесуэлы віншаванні ў сувязі з гэтым. Усё ідзе так, як і павінна ісці. Камусьці ваша перамога не падабаецца, і яны робяць спробы парушыць тую кансалідацыю, якая намецілася ў грамадстве Венесуэлы.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, не трэба гэтаму надаваць надзвычайнае значэнне. Наша краіна гэта таксама перажыла. Але прыйдзе час — і ў свеце зразумеюць ролю Венесуэлы.

— Вы вельмі хутка пераадолееце гэтыя перашкоды ў сувязі з тым, што ў апошнія гады, нават месяцы, свет катастрафічна хутка мяняецца, — упэўнены Прэзідэнт. — Галоўнае, каб вы былі адзінымі ў Венесуэле і верылі ў сваю перамогу.

Што да нашых двухбаковых адносін, яны ў палітычных, дыпламатычных сферах як былі, так і застаюцца сяброўскімі і брацкімі, запэўніў беларускі лідар венесуэльскага госця:

— Яшчэ раз хачу пацвердзіць: усё, што мы сёння маем, усё, што мы сёння можам, мы гатовы пакласці на чашу вашага поспеху ў Венесуэле.

Паміж лідарамі дзвюх краін была дамоўленасць стварыць «дарожную карту» па паглыбленні двухбаковага беларуска-венесуэльскага супрацоўніцтва.

— Ужо ў найбліжэйшы час, а дакладна — падчас майго візіту ў Венесуэлу — мы зможам значна прасунуцца ў нашых адносінах і не толькі зацвердзіць гэтую «дарожную карту» — мы ўжо пачнём яе рэалізоўваць, — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

У Беларусі ёсць тое, што патрэбна Венесуэле — у поўным аб'ёме. А ў Венесуэле ёсць тое, што патрэбна нам.

— І мы на гэтым месцы нават можам нешта зарабіць, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Я думаю, гэта трэба пакласці ў аснову нашых дамоўленасцяў і «дарожнай карты».

Рыкарда Менэндэс паведаміў, што венесуэльскі лідар вялікую ўвагу ўдзяліў падрыхтоўцы і правядзенню бягучага візіту. Па яго словах, тыя кірункі, праекты, якія абмяркоўваліся каля месяца таму на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і Нікаласа Мадуры, зараз распрацоўваюцца.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## Парламенцкі дзённік

# МОСТ ДЛЯ ВЯЛІКАЙ ЕЎРОПЫ

У сталіцы адбылося пасяджэнне Парламенцкай асамблеі ЦЕІ

**Цэнтральна-Еўрапейская ініцыятыва (ЦЕІ) мае тры асноўныя вымярэнні: парламенцкае, урадавае і бізнес-супольнасці. Учора ў Савеце Рэспублікі адбылося ключавое з парламенцкіх мерапрыемстваў у межах старшынства Беларусі ў гэтай арганізацыі ў 2017 годзе — пасяджэнне Парламенцкай асамблеі ЦЕІ.**

Як ужо паведамляла «Звязда», цэнтральнай тэмай пасяджэння сталі інфармацыйныя тэхналогіі ў захаванні бяспекі. «Лічбавая трансфармацыя, пабудова лічбавай эканомікі — ужо новая рэальнасць. Гэта ўклад жыцця, новая аснова для развіцця сістэмы дзяржаўнага кіравання, эканомікі, бізнесу, сацыяльнай сферы, усяго грамадства. Наша краіна можа таксама выступіць платформай для супрацоўніцтва партнёраў ЦЕІ ў IT-індустрыі», — лічыць **Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.** Так, па ацэнцы Міжнароднага саюза электрасувязі, у 2017 годзе Беларусь па індэксе развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій заняла 32-е месца ў рэйтынгу са 175 краін, па развіцці шырокапалоснага доступу — 21-е месца сярод 195 краін, па індэксе гатоўнасці да электроннага ўрада — 49-е са 193 краін. З 2012 года Беларусь уваходзіць у топ-30 вядучых краін свету ў галіне распрацоўкі заказнога праграмнага забеспячэння.

**Эрык ЧАРНОВЕЦ, намеснік генеральнага сакратара Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы,** адзначыў, што гэта першае старшынства Беларусі ў ЦЕІ, «таму яно вельмі важнае». «Тым не менш Беларусь з'яўляецца членам ЦЕІ ўжо 21 год. У склад арганізацыі ўваходзіць 10 дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза і 8 дзяржаў не членаў ЕС, — адзначыў намеснік генеральнага сакратара ЦЕІ. — Місія і мэта — дапамагчы дзяржавам, якія не ўваходзяць у Еўрапейскі саюз, на іх шляху па руху да ЕС. Яшчэ адна мэта ЦЕІ — стаць своеасаблівым мостам паміж макрарэгіёнамі, якія ўваходзяць у нашу арганізацыю. У прыватнасці, паміж Балтыйскімі краінамі, краінамі ракі Дунай і іншымі макрарэгіёнамі».

**Веранiка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

**Каментарый у тэму**

**Уладзімір ВІЦЮК, кіраўнік дэлегацыі Малдовы, віцэ-спікер парламента:**

— Малдова, са свайго боку, мае цэлы шэраг напрацовак у IT-тэхналогіях як у заканадаўчай сферы, так і ўжо ў тэхнічным выкананні. Мы ведаем, што цэлы шэраг краін, і ў першую чаргу Беларусь, дастаткова сур'ёзна назапасілі патэнцыял і вопыт у гэтай сферы. І мы гатовыя і зацікаўленыя ўзаемна падзяліцца тымі напрацоўкамі, якія ёсць у абедзвюх краін. І, вядома, мы высока ацэньваем старшынства і дзейнасць Беларусі. Цэлы шэраг дакументаў быў сур'ёзна прапрацаваны за гэты год. Ён важны для ўсіх удзельнікаў асамблеі і для развіцця IT-тэхналогій.

**Вольфганг ГЕРСТЛ, кіраўнік дэлегацыі Аўстрыі:**

— Мы вельмі рады, што Беларусь праяўляе зараз такую ініцыятыву і што мы можам супрацоўнічаць з рознымі краінамі ў гэтым кантэксце. Сучасны свет — гэта свет глабалізацыі. І таму ўсе краіны ў той ці іншай ступені сутыкаюцца з аднымі і тымі ж пытаннямі. З аднаго боку, лічбавыя тэхналогіі ўяўляюць вельмі важны аспект нашага жыцця і даюць шмат магчымасцяў, з другога, — у нас ёсць досыць вялікая колькасць перашкод. Таму мы павінны працаваць на карысць развіцця і адначасова змагацца, скажам, з кіберзлачыннасцю і распрацоўваць належную нарматыўна-прававую базу для таго, каб лічбавыя тэхналогіі дапамагалі нам у нашай дзейнасці.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

## Ва ўрадзе

# ЦЯЖКІ РОСТ АРШАНШЧЫНЫ

На пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў абмеркавалі праект праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Аршанскага раёна да 2020 года

**Пачынаючы з сярэдзіны красавіка над выкананнем даручэння кіраўніка дзяржавы аб развіцці Аршанскага раёна працуе ўрад сумесна з Віцебскім аблвыканкамам і Аршанскім райвыканкамам. Першапачатковая задача — павышэнне эфектыўнасці фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў рэгіёна і вызначэнне перспектыў іх развіцця.**

За 10 месяцаў гэтага года аб'ём прамысловай вытворчасці на Аршаншчыне ўдалося павысіць на 0,5% да адпаведнага перыяду мінулага года. У сельскай гаспадарцы таксама намецілася станоўчая дынаміка, павялічыліся экспарт і сярэдні заробак. «Дасягнуць гэтых вынікаў было немагчыма без вырашэння многіх складаных праблем пры абмежаваных грашовых рэсурсах. Так, былі разблакаваныя рахункі, без затрымак выплачваецца зарплата, палепшаны ўмовы працы, наведзены парадак у цэхах і на тэрыторыях прадпрыемстваў. Цяжка, але паслядоўна вырашаюцца пытанні па фінансаванні аб'ектаў будаўніцтва аграпрамысловага комплексу», — паведаміў **прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ.**

Ён нагадаў, што на мінулым тыдні першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль Мацюшэўскі і старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарстнёў правялі ў Оршы чарговую рабочую сустрэчу з кіраўнікамі банкаў, Мінсельгасхарча, Мінфіна і Мінэканомікі. Вырашалася асноўная праблема — закрэдытаванасць прадпрыемстваў і адсутнасць рэальнага забеспячэння крэдытаў. «Аднак без нарошчвання вытворчасці малака і мяса не будзе эфектыўна працаваць уся вертыкаль інтэграванай структуры аграпрамысловага комплексу — а гэта аснова эканомікі раёна», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

Прэм'ер-міністр лічыць, што, акрамя аператыўных мер, раёну патрэбна сярэднетэрміновая стратэгія развіцця, дзе на аснове комплекснага аналізу вызначацца дадатковыя пункты росту і матывы арыенціры. Для гэтага прынята рашэнне аб распрацоўцы праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Аршанскага раёна да 2020 года. «У працэсе работы над праграмай з'явілася больш дакладнае разуменне развіцця не толькі дзеючага патэнцыялу, але і стварэння новых напрамкаў, кшталту інфармацыйных тэхналогій, а таксама новых падыходаў да ўдасканалення рознічнага гандлю, прадпрымальніцтва», — паведаміў прэм'ер-міністр. Асноўны распрацоўшчык дакумента — Міністэрства эканомікі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*